*Масейчук Л.І.*

**РОЛЯ КУРАТАРА ВУЧЭБНАЙ ГРУПЫ ПЕРШАГА КУРСА Ў ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЕ (АГУЛЬНЫЯ РЫСЫ)**

*Беларускі дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі*
*Мінск, Беларусь*

**Анатацыя**. У артыкуле разглядаюцца асноўныя напрамкі працы куратара першага курса ў вышэйшай школе. Аўтар слушна адзначае, што гісторыя вышэйшых навучальных установ Беларусі цесна звязана з развіццём інстытута куратарства і мае сваю даўнюю гісторыю. Падкрэсліваецца, што праца куратара рэгламентуецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Куратар выступае ў ролі выхавацеля, настаўніка, арганізатара і выканаўцы педагагічных спраў паколькі студэнты першага курса, у сваёй большасці, падлеткі. Вельмі часта ад яго прафесіяналізму залежыць як паспяховасць навучэнцаў, так і іх грамадзянская пазіцыя.

*Ключавыя словы: куратар, выхаванне, вышэйшая адукацыя, заканадаўства, студэнт, гісторыя.*

***Masejchuk L.I.***

**THE ROLE OF THE CURATOR OF THE FIRST-YEAR STUDY GROUP IN A HIGHER SCHOOL (OVERVIEW)**

*Belarusian State Archive of Scientific and Technical Documentation*
*Minsk, Belarus*

**Abstract.** The article examines the main areas of work of the curator of the first year in the higher school. The author rightly points out that the history of higher educational institutions of Belarus is closely related to the development of the institution of curatorship and has a long history. It is emphasized that the curator's work is regulated by the legislation of the Republic of Belarus. The curator acts as an educator, teacher, organizer and executor of pedagogical affairs, since the majority of first-year students are teenagers. Very often, both the success of students and their civic position depend on his professionalism.

*Keywords: curator, upbringing, higher education, legislation, student, history.*

Адной з форм рэалізацыі выхаваўчай працы ў вышэйшай навучальнай установе з’яўляецца інстытут куратарства, які садзейнічае ўваходжанню першакурсніка ў студэнцкае жыццё, у тым ліку ўключэнню ў сістэму студэнцкага самакіравання факультэта і вышэйшай навучальнай установы, а таксама стварэнню студэнцкага самакіравання ўнутры самой групы.

Праца куратара студэнцкай групы носіць мэтанакіраваны сістэмны характар. Яна ахоплівае як навучальную, так і выхаваўчую працу. Дзейнасць куратара павінна быць скіравана на набыццё студэнтамі высокіх тэарэтычных ведаў, на арганізацыю кантролю над навучальным працэсам і паспяховасцю студэнтаў для магчымай іх карэкціроўкі [1, с. 13].

Інстытут куратарства мае сваю даўнюю гісторыю. Само паняцце «куратар» паходзіць ад лацінскага «curator» – «апякун, папячыцель». Больш дакладна паняцце вызначана ў Педагагічным слоўніку: «Куратар у некаторых навучальных установах – выкладчык, выхавацель, які назірае за навучаннем школьнікаў ці студэнтаў» [2].

Пасля 1917 г. пачалося будаўніцтва новай савецкай школы. Яе мэтай стала палітычнае выхаванне студэнцтва на аснове камуністычнай ідэалогіі, а асноўнай задачай – арганізацыя і гуртаванне студэнцкага калектыву, кантроль наведвання і паспяховасці, нагляд за дысцыплінай і паводзінамі. З гэтага часу гісторыя вышэйшых навучальных устаноў Беларусі цесна звязана з развіццём куратарства.

У лютым 1956 г. Пленум ЦК КПБ разгледзеў пытанне аб паляпшэнні выхаваўчай працы сярод моладзі, дзе звярнуў увагу на ролю выхавацеляў у фарміраванні якасцей спецыяліста вышэйшай школы. На той час неабходныя перадумовы для існавання інстытута куратарства як памочніка ў выхаванні студэнцкай моладзі былі створаны. Куратар прызначаўся ў кожную акадэмічную групу з першага па пяты курс.

Асаблівую ўвагу ролі куратара сталі надаваць у 1960-я гады. Гэта было выклікана задачай аптымізацыі навучальна-выхаваўчай працы ў вышэйшай навучальнай установе і актыўным пошукам унутраных рэзерваў, якія садзейнічалі б яе забеспячэнню.

Пасля распаду СССР, у пачатку 1990-х гг., куратарства на некаторы час увогуле знікла з беларускіх вышэйшых навучальных устаноў.

У 1996 г. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь было прынята рашэнне аб аднаўленні дзейнасці куратараў і зацверджана «Палажэнне аб куратары», якое насіла больш рэкамендацыйны характар і не абавязвала куратараў строга прытрымлівацца прадпісанняў [3].

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь пастановай ад 26 красавіка 2006 г. № 41 зацвердзіла «Інструкцыю аб арганізацыі працы куратара студэнцкай групы ўстановы, якая забяспечвае атрыманне вышэйшай адукацыі» [4]. Інструкцыя ўтрымлівае фармулёўкі, якія дазваляюць зразумець сутнасць дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі. З гэтага часу інстытут куратарства становіцца важным суб’ектам у навучальнай і выхаваўчай працы ў вышэйшай навучальнай установе.

Згодна з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь асноўнымі патрабаваннямі да работы куратара з’яўляюцца прафесійная кампетэнтнасць, асабістая гатоўнасць да ажыццяўлення ідэалагічнай і выхаваўчай працы, грамадзянскасць, высокая маральная і палітычная культура, адказнасць і камунікабельнасць.

Задача куратара – выступаць у ролі выхавацеля, настаўніка, арганізатара і выканаўцы педагагічных спраў на працягу ўсяго шляху студэнта (студэнцкай групы) ва ўніверсітэце.

Дзейнасць куратара падпарадкавана агульным мэтам навучання, выхавання і развіцця асобы студэнта і студэнцкай групы. Кваліфікаваная дзейнасць куратараў спрыяе развіццю ў студэнтаў такіх якасцей як самаарганізацыя, узаемадзеянне і самакіраванне. Выхаванне такога роду

характарыстык магчыма толькі пры наладжванні поўнага даверлівага кантакту паміж настаўнікам і падапечнымі.

У аснове дзейнасці куратара ляжаць інфарматыўная, арганізацыйная, камунікатыўная, кантралюючая і творчая функцыі. Інфарматыўная функцыя накіравана на давядзенне да студэнтаў усёй неабходнай інфармацыі па арганізацыі вучобы ў вышэйшай навучальнай установе. Арганізацыйная функцыя звязана з пазавучэбнай працай, куратар узаемадзейнічае з даручанымі яму студэнтамі ў вольны час. Камунікатыўная функцыя накіравана на стварэнне спрыяльнага псіхалагічнага клімату ў групе. Кантралюючая функцыя ўскладае на куратара абавязкі настаўніка. Творчая функцыя развівае здольнасці ўласна куратара арганізоўваць і ўдасканальваць выхаваўчы працэс, накіраваны на развіццё і станаўленне ўсёй групы.

Адной з найважнейшых задач куратара з’яўляецца пастаянны кантроль паспяховасці студэнтаў, якая фарміруецца пад уздзеяннем цэлага шэрагу фактараў (базавая падрыхтоўка, гатоўнасць і здольнасць успрымаць новы матэрыял, наведванне і г.д.). Немалаважную ролю ў гэтым працэсе іграе спрыяльны псіхалагічны клімат у групе, што ствараецца як пры ўзаемадзеянні студэнтаў унутры калектыва, так і пры зносінах з выкладчыкамі [5, с. 39].

Першакурснік універсітэта павінен вельмі хутка ўліцца ў студэнцкае жыццё, азнаёміцца з правіламі, правамі і абавязкамі, якія існуюць у вышэйшай навучальнай ўстанове, наладзіць стасункі з аднагрупнікамі і выкладчыкамі. У дадзеным выпадку куратар павінен стварыць аптымальныя ўмовы для яго адаптацыі. Вельмі важна, каб учарашні школьнік адчуў сябе ў вышэйшай навучальнай установе камфортна і ўпэўнена. Для гэтага неабходна вывучыць схільнасці, інтарэсы, індывідуальныя асаблівасці кожнага студэнта ў групе.

Стварэнне даверлівых адносін у групе – залог прадуктыўнага ўзаемадзеяння студэнт – куратар. Гэтаму, у сваю чаргу, садзейнічаюць: далучэнне першакурснікаў да карпаратыўнага жыцця вышэйшай навучальнай ўстановы, уцягванне іх у студэнцкія прафсаюзныя, спартыўныя, навукова-даследчыя і творчыя арганізацыі.

Пашырыць кола ведаў студэнтаў аб падзеях, якія адбываюцца ў горадзе, у краіне і за мяжой дае магчымасць куратарская гадзіна. Гэта можа быць збор групы, тэматычная лекцыя, дыскусійная пляцоўка, сумесныя паходы і экскурсіі.

Нярэдка бывае, што ўступаючы ў дарослае жыццё, адарваўшыся ад бацькоў, студэнты першага курса не ведаюць (ці не жадаюць ведаць) як правільна сябе паводзіць і не ўсведамляюць ступень адказнасці за невыкананне правіл. Таму абавязак куратара своечасова інфармаваць сваіх падапечных аб зменах у нарматыўных дакументах, правілах паводзін у грамадскіх месцах і інтэрнаце.

Пасля першага навучальнага семестра і паспяховай здачы першай сесіі студэнты становяцца больш упэўненымі ў сабе. Гэта сведчыць аб тым, што першы – самы складаны адаптацыйны перыяд – скончыўся. У гэты час куратар можа надаць больш увагі прыцягненню студэнтаў да грамадскай дзейнасці факультэта ці ўніверсітэта.

У гэты ж перыяд у студэнцкай групе могуць узнікаць нефармальныя групоўкі, кожная са сваім лідэрам. Задача куратара вызначыць уплыў такіх падгруп на агульны клімат у студэнцкай групе. У залежнасці ад іх уплыву на групу куратар альбо падтрымлівае іх аўтарытэт, альбо імкнецца звесці яго да мінімуму.

Такім чынам, пры працы з групай першага курса куратару неабходна выбудаваць выхаваўчую працу зыходзячы з наступнага:

1. Дакладна інфармаваць кожнага студэнта аб графіку навучальнага працэсу, парадку працы ва ўніверсітэце, пра магчымасць адлічэння пры іх парушэнні. Рабіць гэта трэба недакучліва і спакойна на працягу ўсяго першага семестра.

2. Абавязкова працаваць з групай: арганізоўваць сустрэчы са старшакурснікамі, выяўляць і абмяркоўваць праблемы, якія ўзнікаюць падчас вывучэння канкрэтных дысцыплін, дапамагаць знайсці шляхі іх вырашэння.

3. Праводзіць прафарыентацыйную работу з першакурснікамі: запрашаць вядучых спецыялістаў галіны для гутаркі аб будучай спецыяльнасці, аб перспектывах працаўладкавання па спецыяльнасці, арганізоўваць экскурсіі на прадпрыемствы.

4. Ажыццяўляць разам з групай наведванне музеяў, тэатраў, спартыўных мерапрыемстваў.

5. Наведваць заняткі групы па праблемных дысцыплінах, пастаянна сустракацца з выкладчыкамі, якія вядуць заняткі ў групе, сумесна з імі шукаць шляхі пераадолення ўзнікаючых цяжкасцей у навучанні;

6. Перыядычна наведваць інтэрнаты для высвятлення бытавых умоў студэнтаў, якія там пражываюць.

Такім чынам, роля куратара ў выхаваўчым працэсе вельмі важная. Своечасовае рэагаванне на праблемы, якія ўзнікаюць у студэнцкай групе, дапамагае вырашыць пытанні, звязаныя з паспяховасцю навучэнцаў. Правільная арганізацыя выхаваўчага працэсу спрыяе фарміраванню ў асобы пачуццяў грамадзянскасці, патрыятызму, высокай культуры, павагі да гістарычнага мінулага.

## Літаратура

1. Голубева, О. В. Студенческие объединения: место и роль во внеучебной деятельности вуза / О. В. Голубева, А. В. Хижная, А. А. Бушуева // Мир науки. – 2017. – Т. 5. – № 6. – С. 13.

2. Педагогический энциклопедический словарь [Электронный ресурс]. – Москва, 2022. – Режим доступа : https://slovar.cc/poisk-find.html?searchword=%D0%BA%D1%83%D1%80%D0%B0%D1%82%D0%BE%D1%80&ordering=&searchphrase=all. – Дата доступа : 23.03.2023.

3. Право. Законодательство Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Минск, 2025. – Режим доступа : http://www.levonevski.net/pravo/razdel8/num2/8d2361.html – Дата доступа : 30.04.2023.

4. Постановление Министерства образования Республики Беларусь от 26 апреля 2006 г. № 41 об утверждении Инструкции об организации работы куратора студенческой группы учреждения, обеспечивающего получение высшего образования [Электронный ресурс]. – Минск, 2009. – Режим доступа : https://bsu.by/upload/iblock/6da/Инструкция. – Дата доступа : 28.11.2021.

5. Быстрова, Н. В. Наставничество как процесс формирования личности будущего специалиста / Н. В. Быстрова, С. А. Цыплакова, А. А. Бушуева, К. А. Максимова // Структурные преобразования экономики территорий: в поиске социального и экономического равновесия. Сборник научных статей II Всероссийской научно-практической конференции. –Курск: Юго-Западный государственный университет. – 2019. – С. 37–43.